Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

Смерць нямецкім акупантам!

# Калгаснік Капыльшчыны

Орган Капыльскага РК КП(б)Б.

№ 17 (1770) ЧАЦВЕР 13 красавіка 1944 г.

У ноч на 12 красавіка наша авіяцыя дальняга дзеяння бамбардыравала ваенна-прамысловыя аб'екты г. Канстанца (Румынія). Савецкія самалеты падвергли бамбардыроуцы порт, чыгуначны вузел и нефцяны гарадок горада Канстанца.

## ЗАЯВА СОВЕЦКАГА УРАДА

Вечарам 2 красавика Народны Камисар Замежных Спрау СССР таварыш В. М. Молатау запрасиу да сябе прадстаунику совецкага и замежнага друку и зрабиу ад имени Совецкага Урада наступную заяву:

„Чырвоная Армия у выніку паспяховага прасоування уперад вышла на раку Прут, якая з'яуляецца дзяржаунай границай памиж СССР и Румынияй. Гэтым палажан пачатак поунага аднаулення совецкай дзяржаунай границы, установленай у 1940 годзе дагаворам памиж Совецким Саюзам и Румынияй, вераломна парушанай у 1941 годзе румынским урадам у саюзе з гитлераускай Германияй. У сучасны момант Чырвоная Армия праводзиць ачышчэнне совецкай тэрыторыи ад усих знаходзячыхся на ёй варожых войск, и ужо недалека той час, кали уся совецкая граница з Румынияй будзе поунасцю адноулена. Совецки Урад даводзиць да ведама, што наступаючыя часци Чырвонай Армии, праследуючы германския армии и саюзныя з ею румынския войски, перайшли на не вяльких участках раку Прут и уступили на румынскую тэрыторыю.

Вярхоуным Галоунакамандаваннем Чырвонай Армии дан загад совецким наступаючым часцям праследаваць ворага да поунага яго разгрому и капитуляцыи.

Разам з тым Совецки Урад заяуляе, што ён не праследуе мэты набыцця якой-небудзь частки румынскай тэрыторыи, ци змянення исвуючага грамадскага строю Румынии, и што уступленне совецких войск у прадзелы Румынии дыктуецца выключна ваеннай неабходнасцю и працягваючымся супрацивуленнем войск ворага". (ТАСС).

## Чэрчыль аб заяве Совецкага Урада

Як перадае агенцтва Рэйтэр, английски прэм'ер-министр Чэрчыль сказау у палаце абшчын, што заяуленне Наркома Замежных Спрау Молатава аб Румынии прадстаулле сабою выключна адавальняючы прыклад супрацоуництва саюзникау.

## ХРОНИКА

Указами Прэзидыума Вярхоунага Совета Саюза ССР ад 10 красавика 1944 года маршалы Совецкага Саюза Жукау Г. К. и Василеуски А. М. за умелае выкананне заданняу Вярхоунага Галоунакамандавання па кираунийтву баявыми аперацыями вяликага маштаба, у рэзультаце яких дасягнуты выдаючыеся поспехи у справе разгрома нямецка-фашыцких захопникау, узнагароджаны орденам „Пабеда".

## Маршалу Иосифу СТАЛИНУ

У момант, кали уселераможная Чырвоная Армия, а в ёй и Чэхаславацкая брыгада дасягнули границ нашай рэспублики, пасылаю Вам, як Вярхоунаму Галоунакамандуючаму и прадстаунику народау Совецкага Саюза, ад имени нашага народа, Чэхаславацкага Урада и ад сябе асабиста самыя сардэчныя виншаванни.

Чырвоная Армия, уступаючы сёння на зямлю нашай Радзимы, атрымоувае новую вялікую перамогу над нашым агульным ворагам и прыносиць нашаму народу свабоду и надзею на шчасце и безапаснасць у будучым. У гэту гистарычную минуту успамиваю не тольки аб усёй нашай абаюднай дружбе у минулым и укрэпленай зноу маёй апошняй паездкай у Маскву и падписаннем нашага новага договара, але перажываю пачуццё радасци и у прадбачанни нашага будучага супрацоуництва для справы забяспечання еурапейскага мира сумесна з другими саюзниками и к дабру абаих нашых дзяржау. Нашы сумесныя выпрабаванни и цяперашняя наша сумесная барацьба гарантуюць пастаяннасць нашага саюза, як на сённяшни дзень, так и для усяго нашага будучага.

Горача и з удзячнасцю витаю часци Чырвонай Армии, уступаючыя сумесна з чэхаславацкими салдатами на зямлю нашай дарагой Радзимы.

ДОКТАР ЭДУАРД БЕНЕШ.

ЛОНДАН.

## Пану Эдуарду БЕНЕШУ, Прэзидэнту Чэхаславацкай Рэспублики

Дзякую Вам за дружалюбныя виншаванни па случаю поспехау Чырвонай Армии и выхада совецких войск к границам Чэхаславакии. Не сумняваюся, што сумесная барацьба нашых народау супроць агульнага ворага прывядзе у хутким часе да аднаулення свабоды и незалежнасци Чэхаславацкай Рэспублики.

И. СТАЛИН.

## Адказ таварыша М. И. КАЛИНИНА на виншаванни

Прыношу глыбокую удзячнасць усим арганизацыям, групам и асобам, якия прыслали прывитанни и виншаванни у сувязи з 25-годдзем майго прабывання на пасту кираунийка вярхоунага органа совецкай улады.

М. КАЛИНИН.

# НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

За час з 1 па 10 красавіка войскі 1-га Украінскага фронта знішчылі больш **26.000** и узялі у палон 6.988 нямецких салдат и афіцэрау групироуки праціуніка, якая была акружана у раёне гора да Скала.

На працягу з 10 па **12** красавика нашы войски вялі на ступальныя баі у Румыніі и авалодалі гарадамі **Рэдауцы, Солька, Сучава, Пашкани, Фэлцичени**, чыгуначнымі вузламі **Дэрменэшци, Верэшци, Долгаска**, а таксама з баямі занялі звыш **160** другіх населеных пунктау.

На **Яскім** напрамку нашы войскі працягвалі наступленне і 10 красавика авалодалі горадам **Тыргу-Фрумос**, а таксама з баямі занялі больш 30 другіх населеных пунктау, сярод якіх **Вултурул** (8 клм. на паўночны захад ад горада Ясы).

На **Кішынеускім** напрамку нашы войскі авалодалі райцэнтрамі Малдаускай ССР **г. Дубасары, г. Грыгорыопаль**, а таксама з баямі занялі звыш 60 населеных пунктау.

На **Тыраспольскім** напрамку нашы войскі прасоувалися уперад і 11 красавіка авалодалі райцэнтрам **Малдаускай ССР Слабадзея Малдаванская**, а таксама занялі больш 100 другіх населеных пунктау.

Войскі **3-га Украінскага** фронта, у выніку начнога штурма, 12 красавіка авалодалі горадам **Тыраспаль**—важным апорным пунктам абароны немцау на Днястры.

Войскі **3-га Украінскага** фронта 10 красавіка, у выніку умелага абходнага манеура пяхоты і коннамеханізаваных злучэнняу у спалучэнні з франтальнай атакай, авалодалі важным гаспадарча-палітычным цэнтрам краіны абласным горадам **Украіны** і першакласным портам на **Чорным** моры—**ОДЭСА**—магутным апорным пунктам абароны немцау, прыкрываючым шляхі к цэнтральным раёнам Румыніі.

На днях войскі 4-га Украінскага фронта пад каманда ваннем генерала арміі **Талбухіна** перайшлі у наступленне супроць нямецка-фашысцкіх войск, размешчаных на **Перакопскім** перашэйку і паўднёвым пабярэжжы Сіваша. Нашы войскі прарвалі вельмі умацаваную абарону праціуніка на **Перакопскім** перашэйку, прасунуліся уперад да 20 клм., авалодалі горадам **Армянск** і выйшлі к **Ішуньскім** пазіцыям праціуніка. Адначасова войскі фронта, фарсіраваушы Сіваш на усход ад горада Армянск, прарвалі глыбока эшаланіраваную абарону праціуніка у аэёрных дэфіле на паўднёвым узбярэжжы Сіваша і, прасунуўшыся уперад за **4** дні наступальных баёу да **60** клм., авалодалі важным чыгуначным вузлом **Крыма—Джанкой.**

Войскі Асобнай **Прымолскай** Арміі пад камандаваннем генерала арміі **Ерёменка**, перайшоушы у наступленне, прарвалі вельмі умацаваную абарону праціуніка на **Керчанскім** паўвостраве і **11** красавіка авалодалі горадам і крэпасцю Керч—важным апорным пунктам абароны немцау на усходнім пабярэжжы **Крыма**. Развіваючы наступленне, нашы войскі прасунуліся на захад ад Керчы да **30** клм., перавалілі праз **Турэцкі вал** і з баямі занялі звыш **40** населеных пунктау.

Войскі **4-га Украінскага** фронта прарвалі вельмі умацаваныя Ішуньскія пазіцыі праціуніка і, праследуючы яго адступаючыя войскі, з баямі занялі больш **150** населеных пунктау, у тым ліку раённыя цэнтры Крыма: **Колай, Курман-Кемельчы, Сейтлер, Біюк-Онлар, Карача-Кангіл** (**18** клм. на поўнач ад горада Сімферопаль).

На **Феадосійскім** напрамку нашы войскі, праследуючы паспешна адступаючага праціуніка, **12** красавіка поунасцю ачысцілі **Керчанскі** паўвостраў і перайшлі **Акманайскія** пазіцыі. У ходзе наступлення нашы войскі вызвалілі звыш **140** населеных пунктау, у тым ліку райцэнтр Крыма **Сем Калодзезей**. Нашы войскі узялі у палон звыш **2.000** салдат і афіцэрау праціуніка.

# ДОБРЫ ПАСТУПАК СЯЛЯНКИ

Бешаныя паліцайскія сабакі ужо некальки раз урываюцца у Яскую вёску, каб казніць жыхароу, але ім яшчэ ні разу не удалося застаць людзей.

Так было и на гэты раз. Паўднём ускочылі шакалы у вёску. Але людзі успелі схавацца. Тольки некаторыя немагучыя старыкі асталися у хатах. Тады паліцаи пайшлі на хітрасць. Прытаіліся шакалы, нікога не выпускалі з вёскі і чакалі да ночы: яны разлічвалі, што людзи вечарам сабе рупца у вёску, палічыушы, што там ужо нікога няма.

Але крывавы план паліцаяу праваліуся дзякуючы добраму пaступку адной сялянкі. 50-гадовая жанчына Н. праз паліцэйскую засаду вечарам выпаузла з вёскі і папярэдзіла ехаушых партызан і людзей, якия хавалися у лесе, каб яны не ішлі у вёску, бо там яшчэ знаходзіліся гітлерауския бандыты.

Так, рыскуючы сваім жыццём, савецкая патрыётка выратавала жыццё многім дзесяткам сваіх аднавяскоуцау и ехаушым партызанам.

**Васіль А.**

# Суровая помста прадажным сабакам

Ні перад чым не спыняюцца у свайй прадсмертнай злосці немцы и іх халуи. На-днях яны спалілі пасёлак Кудзінавічы, Копыльскага раёна.

Самыя паслушныя сабакі у немцау—гэта паліцэйскія. 8 красавіка яны акружылі вёску Кукавічы. Их ахвярай на гэты раз сталі 65-гадовая Кляцко Зося, яе сын Іван—21 год і Валодзя—15 гадоу. Паліцэйския іх загналі у гумно и падпалілі. Не у чым невінныя людзі жывымі згарэлі у агні.

Прах загінуўшых у агні, целы павешаных, замучаных, расстраляных нашых родных клічуць нас да суровай помсты прадажным фашысцкім сабакам. **Н. К.**

# Узрываюць нямецкия аутамашыны

Група партызан (ст[illegible] тавары[illegible] Т.) на міне узарвала аутамашыну праціуніка з прадуктамі. У выніку узрыва забіты 3 немцы. Адначасова гэтай групай была замініравана у лесе ячэйка сакрэта праціуніка, дзе былі забіты яшчэ два немцы.

Другая група партызан на дарогах Станькоу-Дзержынск и Негарэлае-Комалава узарвала дзве грузавыя аутамашыны немцау. **Л. Н.**

РЭДКАЛЕГІЯ